ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.06.2025 № 103

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» (далей – вучэбная праграма) прызначана для II класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 68 гадзін (2 гадзіны на тыдзень).

3. Мэты вучэбнага прадмета:

авалоданне маўленчай і чытацкай дзейнасцю на беларускай мове; азнаямленне з багатым светам беларускай дзіцячай літаратуры як мастацкім словам, далучэнне да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцей падчас чытання і асэнсавання літаратурных твораў;

фарміраванне пісьменнага чытача, які валодае навыкам чытання, культурай маўлення, спосабамі самастойнай работы з тэкстам і дзіцячай кнігай, разумення значэння чытання для паспяховага навучання, будучай дзейнасці, самаадукацыі і самаразвіцця на працягу ўсяго жыцця.

4. Дасягненне гэтых мэт становіцца магчымым праз вырашэнне наступных задач:

фарміраваць цікавасць да кніг і чытання, пашыраць чытацкі кругагляд;

развіваць навыкі чытання па-беларуску і ўніверсальныя вучэбныя дзеянні, якія забяспечваюць паспяховае вывучэнне любога вучэбнага прадмета;

удасканальваць камунікатыўна-маўленчыя ўменні навучэнцаў;

фарміраваць чытацкія ўменні, літаратурныя ўяўленні і веды, неабходныя для ўспрымання літаратуры як мастацтва слова, разумення твораў, вылучэння, збору, тлумачэння інфармацыі ў навукова-пазнавальных і вучэбных тэкстах;

развіваць уяўленні пра аўтараў мастацкіх твораў, іх творчасць;

удасканальваць уменні, звязаныя з літаратурна-творчай дзейнасцю на аснове вывучаемых твораў;

развіваць эмацыянальную спагадлівасць, уяўленне, крытычнае мысленне і творчую актыўнасць;

фарміраваць сродкамі літаратуры традыцыйныя каштоўнасныя арыенціры, выхоўваць грамадзянскія і духоўна-маральныя якасці асобы.

5. На ўроках літаратурнага чытання выкарыстоўваецца метад жывога слова ў разнастайных формах: гутарка, пераказ, слоўнае маляванне, апісанне ілюстрацый, чытанне на памяць, выразнае чытанне.

Вядучым метадам фарміравання чытацкіх уменняў з’яўляецца аналіз тэксту літаратурнага твора. Аналіз праводзіцца ў форме практычнай работы з тэкстам: акцэнтнае вычытванне ўрыўкаў тэксту з апісаннем учынку героя, карцін прыроды, вобразных слоў і выразаў, слоў-носьбітаў характарыстыкі персанажаў, слоў, якія ўказваюць на пачуцці і настрой; пошук адказаў на пытанні педагагічнага работніка; вылучэнне сэнсавых частак, складанне плана.

Для арганізацыі літаратурна-творчай дзейнасці на ўроку выкарыстоўваюцца практычныя метады навучання. Навучэнцам прапануюцца разнастайныя творчыя заданні па змесце прачытанага твора: разыгрыванне дыялогаў, эпізодаў, пастаноўка «жывых карцін» з выкарыстаннем руху, мімікі, жэстаў; чытанне па ролях; харавая дэкламацыя асобных урыўкаў (паўтораў, песень), літаратурныя гульні; мадэляванне вокладкі кнігі.

На ўроках выкарыстоўваецца аналіз эмацыянальнага зместу твора; практыкаванні па чытанні ўслых дыялогаў, эмацыянальна насычаных урыўкаў тэксту, пошук варыянтаў дакладнай перадачы пачуццяў, настрою, стану герояў; узорнае выразнае чытанне педагагічнага работніка.

Навучанне літаратурнаму чытанню ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму падпарадкоўваецца прынцыпу ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя. Гэты прынцып вызначае адбор зместу навучання, з дапамогай якога будзе пераадольвацца інтэрферанцыйнае ўздзеянне рускай мовы пры фарміраванні навыку чытання, захаванні акцэнталагічнай нормы, разуменні лексічнага значэння слоў.

Пры фарміраванні навыку чытання асноўная ўвага накіравана на асэнсаванне навучэнцамі асаблівасцей чытання па-беларуску. З гэтай мэтай праводзіцца работа па авалоданні арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [дз’], [дж], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], спалучэння [шч], падоўжаных зычных, выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары і, ў, апостраф), усведамленню гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачай пры чытанні.

Пазакласнае чытанне ў II класе ўключае два этапы фарміравання чытацкай самастойнасці: падрыхтоўчы і пачатковы. На падрыхтоўчым этапе, згодна з методыкай выкладання пазакласнага чытання, адбываецца непасрэднае чытанне-разгляд невялікіх маляўніча аформленых кніг з мэтай фарміравання ўменняў вызначаць змест кнігі па знешніх паказчыках, выбіраць патрэбную кнігу з рэкамендацыйнага спісу ці выставы

кніг. Арганізуецца актыўнае асэнсаванае ўспрыманне навучэнцамі твора з кнігі на слых.

Па меры авалодання чытаннем на беларускай мове пачынаецца выкладанне пазакласнага чытання па методыцы пачатковага этапу фарміравання чытацкай самастойнасці. На ўроках пазакласнага чытання пасля чытання-разгляду кніг навучэнцы самастойна чытаюць твор з кнігі, якую прынеслі на ўрок.

Вядучым метадам работы з дзіцячай кнігай на пазакласным чытанні з’яўляецца метад чытання-разгляду.

Працэс навучання літаратурнаму чытанню рэалізуецца праз франтальную форму работы, якую рэкамендуецца спалучаць з калектыўна-размеркавальнай, групавой, парнай і індывідуальнай формамі навучання. Выбар форм і метадаў навучання і выхавання педагагічны работнік ажыццяўляе самастойна ў адпаведнасці з вучэбнымі задачамі канкрэтнага ўрока літаратурнага чытання.

У дадзенай вучэбнай праграме рэалізуюцца пераемныя сувязі з вусным і ўступным курсамі навучання беларускай мове.

6. Чаканыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» па заканчэнні навучання і выхавання:

6.1. асобасныя: усведамленне нацыянальнай прыналежнасці і спасціжэнне культурнай спадчыны краіны падчас чытання дзіцячай літаратуры; развіццё матываў чытацкай дзейнасці, асабістага сэнсу, рэфлексіі, эстэтычных патрэб і чытацкага густу; асваенне маральных норм і духоўных каштоўнасцей пры навучанні літаратурнаму чытанню;

6.2. метапрадметныя: інтэлектуальна-пазнавальныя (авалоданне лагічнымі дзеяннямі, устанаўленне аналогій, прычынна-выніковых сувязей; рашэнне праблем літаратурна-творчага і пошукавага характару); інфармацыйна-чытацкія (авалодванне стратэгіямі сэнсавага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў; уменнямі, якія звязаны з пошукам, зборам, пераўтварэннем інфармацыі; фарміраванне ўласнага меркавання і яго аргументацыя; уменне рабіць высновы, інтэграваць і інтэрпрэціраваць інфармацыю); арганізацыйна-рэгулятыўныя (авалодванне ўменнямі прымаць і захоўваць мэты і задачы чытацкай дзейнасці; планаваць, кантраляваць, карэкціраваць і ацэньваць выкананыя дзеянні; знаходзіць эфектыўныя спосабы дасягнення мэты, прагназаваць і ўсведамляць якасць засвоеных ведаў); сацыяльна-камунікатыўныя (выкарыстанне маўленчых сродкаў для вырашэння камунікатыўных і літаратурна-пазнавальных задач; прыняцце розных меркаванняў, якія неабходны для разумення свету, сябе і іншых людзей);

6.3. прадметныя: уменне чытаць тэкст услых усвядомлена, правільна і выразна; працаваць з тэкстам твора: вызначаць тэму, характарызаваць

герояў, ацэньваць іх учынкі, вызначаць аўтарскую пазіцыю, тлумачыць галоўную думку твора, дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, складаць план, пераказваць твор; ведаць асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці, выкарыстоўваць іх на практыцы; адрозніваць асноўныя элементы і віды кніг; выконваць творчыя работы; карыстацца паслугамі бібліятэкі.

7. Змест вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» складаюць чатыры асноўныя кампаненты:

прадметныя веды (першы кампанент);

прадметныя ўменні (чытацкія і камунікатыўна-маўленчыя) і метапрадметныя ўменні (універсальныя вучэбныя дзеянні) (другі кампанент);

вопыт літаратурна-творчай дзейнасці (трэці кампанент);

вопыт эмацыйна-каштоўнасных адносін (чацвёрты кампанент).

Усе кампаненты зместу вучэбнага прадмета прадстаўлены комплексна і фарміруюцца на аснове ведаў тэкстаў мастацкіх і навукова-пазнавальных твораў.

Прадметныя веды фарміруюцца падчас практычнай работы з тэкстамі твораў вуснай народнай творчасці, класічнай і сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры. Дадзенай вучэбнай праграмай прадугледжана авалоданне прадметнымі (тэарэтыка-літаратурнымі) ведамі на практычным узроўні. Прадметныя веды складаюць літаратурныя ўяўленні навучэнцаў пра віды твораў вуснай народнай творчасці і аўтарскай літаратуры; пра выяўленча-выразныя сродкі мовы мастацкага твора; пра сродкі выразнага чытання; сціслыя біяграфічныя звесткі аб жыцці і творчасці дзіцячых пісьменнікаў, якія рэкамендаваны для чытання ў II класе; прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх навучэнцы неаднаразова сустракаюцца на старонках падручніка па літаратурным чытанні, назвы і змест найбольш упадабаных твораў; тэксты, якія рэкамендаваны для завучвання на памяць.

Чытацкія ўменні складваюцца з уменняў чытаць, працаваць з тэкстам твора і дзіцячай кнігай, якія фарміруюцца ў працэсе аналізу літаратурнага твора і ўяўляюць сабою дзеянні па арыенціроўцы ў тэксце, звязаныя з яго ўспрыманнем, усведамленнем, ацэнкай зместу і сэнсу.

Чытацкія ўменні, якія маюць універсальны характар, выкарыстоўваюцца падчас працы з тэкстамі розных відаў (вучэбных, навуковых, навукова-папулярных, публіцыстычных) і адносяцца да метапрадметных (інтэлектуальна-пазнавальных, інфармацыйна-чытацкіх, арганізацыйна-рэгулятыўных, сацыяльна-камунікатыўных).

Камунікатыўна-маўленчыя ўменні суправаджаюць чытацкую дзейнасць і выконваюць функцыю чытацкіх уменняў, якія рэалізуюцца ў маўленчай форме (стварэнні звязных вусных выказванняў для перадачы

зместу тэксту і зносін паміж чытачамі, адборы сродкаў моўнага афармлення выказвання).

Вопыт літаратурна-творчай дзейнасці набываецца навучэнцамі падчас выканання разнастайных творчых заданняў у сувязі з прачытаным творам.

Вопытам эмацыйна-каштоўнасных адносін навучэнцы авалодваюць у працэсе аналізу мастацкага твора, вызначэння аўтарскай пазіцыі, ацэнкі падзей і персанажаў, супастаўлення з асабістым успрыманнем, аргументацыі сваёй ацэнкі ўчынкаў герояў і падзей, параўнання яе з меркаваннем аднакласнікаў.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» прадстаўлены раздзеламі: «Кола чытання», «Фарміраванне навыку чытання і ўніверсальных вучэбных дзеянняў», «Фарміраванне чытацкіх уменняў і ўніверсальных вучэбных дзеянняў», «Літаратурная прапедэўтыка», «Літаратурна-творчая дзейнасць навучэнцаў», «Пазакласнае чытанне», «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў».

Раздзел «Кола чытання» змяшчае апісанне вучэбнага матэрыялу і рэкамендаваны пералік твораў для чытання і вывучэння з указаннем колькасці гадзін на вывучэнне тэм чытання. Рэкамендаваны пералік твораў складаецца з двух спісаў: для чытання і вывучэння ў класе і для пазакласнага чытання.

У раздзеле «Фарміраванне навыку чытання і ўніверсальных вучэбных дзеянняў» пададзены змест працы па фарміраванні чытацкіх уменняў. Прадугледжана фарміраванне наступных метапрадметных уменняў: чытанне як універсальнае вучэбнае ўменне, пастаноўка вучэбнай задачы чытання, планаванне дзейнасці пры падрыхтоўцы да слоўнага малявання, чытання па ролях, выразнага чытання, самаацэнка чытання.

Раздзел «Фарміраванне чытацкіх уменняў і ўніверсальных вучэбных дзеянняў» змяшчае пералік уменняў, якімі авалодваюць навучэнцы падчас практычнай работы з тэкстамі мастацкіх і навукова-пазнавальных твораў.

У раздзеле «Літаратуразнаўчая прапедэўтыка» вызначана кола літаратуразнаўчых уяўленняў, якія фарміруюцца ў навучэнцаў у працэсе чытання і аналізу канкрэтных твораў. Навучэнцы назіраюць жанравую разнастайнасць літаратуры, адкрываюць для сябе «законы пабудовы» скорагаворкі, загадкі, пазнаюць асноўныя прыметы казкі, верша, апавядання, назапашваюць уяўленне аб аўтарах твораў і дзіцячых кніг.

Раздзел «Літаратурна-творчая дзейнасць навучэнцаў» уключае пералік відаў самастойнай літаратурна-творчай дзейнасці, якімі навучэнцы авалодваюць падчас выканання разнастайных заданняў творчага характару ў сувязі з прачытаным творам (падбор подпісаў да ілюстрацый, слоўнае і

графічнае маляванне, разыгрыванне дыялогаў, эпізодаў, пастаноўка «жывых» карцін і іншыя заданні).

У раздзеле «Пазакласнае чытанне» дадзена характарыстыка вучэбнага матэрыялу, які складае кола чытання навучэнцаў, тэматыка чытання, пададзены патрабаванні да аб’ёму і афармлення дзіцячай кнігі, відаў выдання (зборнік аўтарскі ці тэматычны). Вызначаны віды самастойнай чытацкай дзейнасці, формы індывідуальнай і групавой работы з кнігай у пазаўрочны час, пералік ведаў і ўменняў работы з дзіцячай кнігай.

У раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў» устаноўлены патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў па літаратурным чытанні.

Дадзеная вучэбная праграма арыентуе на ўзаемасувязь вучэбных прадметаў «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» і «Беларуская мова» праз засваенне маўленчазнаўчых паняццяў: «тэма і асноўная думка тэксту», «загаловак тэксту», «структура тэксту», «сувязь загалоўка з тэмай і асноўнай думкай тэксту», «план тэксту».

8. Састаўной часткай вучэбнага прадмета з’яўляецца пазакласнае чытанне. Мэта пазакласнага чытання – пазнаёміць навучэнцаў з кнігамі з даступнага ім кола чытання; сфарміраваць цікавасць да кніг, жаданне і ўменне іх выбіраць і чытаць; навучыць працаваць з кнігай як з асаблівым аб’ектам.

Навучэнцы авалодваюць ведамі аб элементах кнігі, якія дазваляюць чытачу арыентавацца ў любой кнізе і групе кніг (загаловак, прозвішча аўтара, ілюстрацыі, змест, прадмова, аб сродках арыентацыі ў свеце кніг (кніжная выстава, плакат, рэкамендацыйны спіс), аб газетах і часопісах як перыядычных выданнях; аб культуры і гігіене чытання. Навучэнцы набываюць уменне самастойна выбіраць кнігі на прапанаваную тэму, карыстацца арыенціровачным апаратам кнігі, відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (з прыцягненнем бібліятэкара).

У пазаўрочны час у сістэме пазакласнага чытання практыкуецца правядзенне літаратурных ранішнікаў, віктарын, конкурсаў чытачоў, работа ў «майстэрні па рамонце кніг». Урокі пазакласнага чытання праводзяцца пасля вывучэння асноўных тэм чытання і ўваходзяць у агульную колькасць гадзін, адведзеных на вучэбны прадмет. На працягу чарговага адрэзка часу педагагічны работнік кіруе самастойным пазаўрочным чытаннем кніг, газет, часопісаў.

9. Дадзеная вучэбная праграма арыентуе на ажыццяўленне міжпрадметных сувязей з вучэбнымі прадметамі «Русская литература (литературное чтение)», «Выяўленчае мастацтва», «Музыка» падчас фарміравання ў навучэнцаў уяўленняў: «жанр», «мастацкі вобраз», «задумка аўтара», «тэма», «форма», «змест», «рытм», «настрой», «аўтар».

10. Асноўнымі відамі дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання з’яўляюцца чытанне ўслых і пра сябе (моўчкі), выразнае чытанне, чытанне па ролях, выбарачнае чытанне, завучванне на памяць вершаваных твораў, скорагаворак, загадак, прыказак; слуханне; пераказ па пытаннях педагагічнага работніка, апорных словах, ілюстрацыях ці гатовым плане; слоўнае маляванне паэтычных карцін, стварэнне графічных і слоўных ілюстрацый да твора; завучванне і разыгрыванне дыялогаў; аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора; чытанне-разгляд дзіцячых кніг.

## ГЛАВА 2

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў II КЛАСЕ
## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(59[1] гадзін, з іх 49 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка навыку чытання)

### КОЛА ЧЫТАННЯ

### КОЛЕРЫ ГОДА. ВОСЕНЬ

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра прыгажосць восеньскай прыроды, змены, якія адбываюцца ў прыродзе восенню.

Для чытання і вывучэння ў класе

Вера Вярба. «Восень».
М. Даніленка. «Па лясах і палях».
Р. Ігнаценка. «Лістапад у лесе».
Якуб Колас. «Адлёт жураўлёў».
П. Прануза. «Бывай, лета!».
М. Чарняўскі. «Павучковыя арэлі».
У. Ягоўдзік. «Восень на парозе».

Для пазакласнага чытання

---

[1] Вывучэнне «Літаратурнага чытання» пачынаецца пасля ўступнага курса беларускай мовы. 9 гадзін выкарыстана на інтэграваны ўступны курс.

Г. Аўласенка. «Клён».
Р. Бензярук. «Хто каго перакрычыць?».
Н. Галіноўская. «На прагулцы».
М. Даніленка. «Восень шыла сарафан».
А. Дзеружынскі. «Хто вас у школу сабіраў?».
Я. Жабко. «Залатая казка», «Восень вераснёвая».
В. Жуковіч. «Маладая восень».
Клаўдзія Каліна. «Верасень».
Г. Каржанеўская. «Песенька».
М. Пазнякоў. «Першага верасня».
С. Панізнік. «Верасень».

## МАЁЙ РАДЗІМЫ ДЗІЎНЫ СВЕТ
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра адносіны да Радзімы, хлеба, пра прыродныя сімвалы Беларусі.

### Для чытання і вывучэння ў класе

А. Бадак. «Шкадаванне».
Р. Бензярук. «Хмарчын ручнік».
А. Грачанікаў. «Беларускія краявіды».
А. Дзеружынскі. «Хлебная скарынка».
В. Жуковіч. «Васілёк».
А. Зэкаў. «Беларускі край».
А. Кобец-Філімонава. «Кропелька».
Ф. Рамашка. «Татава поле».
Л. Улашчанка. «Хлеб».
М. Чарняўскі. «Лён-ляночак».

### Для пазакласнага чытання

Р. Бензярук. «Шпак і Верабей».
Н. Галіноўская. «Журка-журавель».
А. Дзеружынскі. «Васілёк», «Прыляцеў я ў свой край».
В. Жуковіч. «Жураўліны вырай», «Незаменнае».
М. Калачынскі. «Размова з жураўлём».
У. Ліпскі. «Салдацкае пісьмо».
М. Пазнякоў. «Міколкавы пытанні», «Скарб», «Родная мова».

## ЖЫВАЯ КНІГА БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра жывёл і расліны беларускага краю.

### Для чытання і вывучэння ў класе

Г. Аўласенка. «Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе».
А. Бялевіч. «У лесе».
В. Вольскі. «Гаспадар пушчы».
Н. Галіноўская. «Хто жыве ў траве?».
В. Жуковіч. «Птушыная мова».
Янка Журба. «Мядзведзь».
Р. Ігнаценка. «У арэхах».
Ф. Рамашка. «Званочкі на рабіне».

### Для пазакласнага чытання

Д. Бічэль. «Зубры».
Н. Галіноўская. «Арабінка».
І. Галубовіч. «Шышкі пад снегам», «Галкі грэюцца».
М. Даніленка. «Абляпіха».
Р. Ігнаценка. «Рамантык», «Плячо да пляча», «Трывога».
У. Караткевіч. «Белавежа».
У. Мазго. «Птушыная сталоўка».
А. Марціновіч. «Верабейка Чыка».
І. Муравейка. «Для чаго снягір каляровы?», «Зімовы сад».

## КОЛЕРЫ ГОДА. ЗІМА
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра зімовыя забавы, святы, прыродныя з’явы.

### Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Галіноўская. «Размова сняжынак».
В. Жуковіч. «З гары».
Р. Ігнаценка. «Чырвоныя гронкі рабіны».
У. Мазго. «Новы год».
Т. Мушынская. «Мех, снег і смех».
Ф. Рамашка. «Пагрэйся, ветрык».

В. Хомчанка. «Галка», «Снег».

Беларуская народная казка «Два Маразы» (у апрацоўцы Якуба Коласа).

Для пазакласнага чытання

М. Бусько. «Зіма».
Т. Бушко. «Сняжынка».
Я. Галубовіч. «Андрэйка-памочнік».
М. Даніленка. «Як Петрык мароз напалохаў».
К. Жук. «Беларуская зіма».
В. Жуковіч. «Снежная баба».
К. Камейша. «Першы снег».
В. Караткевіч. «Апошняя сняжынка».
В. Лукша. «За што люблю я Новы год?».
М. Пазнякоў. «На горку!», «Зімовыя птушкі».
П. Прыходзька. «Сінічка».
Ю. Свірка. «З першым снегам!».
П. Ткачоў. «Мікіткаў падарунак», «Пад Новы год».

## СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ
(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Знаёмства з беларускімі народнымі казкамі.

Для чытання і вывучэння ў класе

«Каза-манюка».
«Лісіца і Гусак».
«Муха-пяюха».
«Хітры вол».

Для пазакласнага чытання

«Баран – бок абадран».
«Дзедава рукавічка».
«Казка пра быка і яго сяброў».
«Камары і мядзведзь».
«Коцік, Певнік і Лісіца».
«Не сілай, а розумам».
«Пiліпка-сынок».
«Пшанічны каласок».

«Сабака і воўк»
«Сынок-з-кулачок».
«Як курачка пеўніка ратавала».

## УРОКІ ЖЫЦЦЯ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра добрыя і дрэнныя ўчынкі, стаўленне людзей адзін да аднаго, павагу і клопат, адносіны да працы.

### Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Хто пачынае дзень?».
В. Вітка. «Чатыры пажаданні».
У. Карызна. «Самая лепшая».
Янка Купала. «Хлопчык і лётчык».
В. Ластоўскі. «Варона і рак».
І. Муравейка. «Куплёная груша».
Максім Танк. «Жук і слімак».
В. Хомчанка. «Самы лепшы малюнак».
А. Якімовіч. «Хто самы добры?».

### Для пазакласнага чытання

Л. Арабей. «Зернетка і вецер».
Г. Аўласенка. «Сказ пра Мураша-лайдака».
Р. Бензярук. «Клекатунчык», «Заяц, Вожык і Ручай», «Чыя моркаўка?».
Я. Бяганская. «Каму сказаць “дзякуй”», «Сябры».
Н. Галіноўская. «Ветлівы свавольнік», «Няўважлівыя лісяняты», «Выратаваў».
В. Гурыновіч. «Добрыя суседзі».
М. Даніленка. «Заяц Доўгае Вуха», «Салодкая цыбуля».
А. Дзеружынскі. «Памочніца».
А. Жук. «Хто вінаваты?».
В. Жуковіч. «Не ўмею, паспею…», «Хто вінаваты?».
Р. Ігнаценка. «Наш мосцік».
У. Карызна. «Чыстая градка».
Л. Качанка. «Яблычак».
Клаўдзія Каліна. «Хлопчык Пакідайчык».
М. Лук. «Выпадак з марожаным».

І. Муравейка. «Ціма», «Тры лыжкі».
У. Немізанскі. «Два Васі».
С. Панізнік. «Чарадзейныя словы».
М. Пазнякоў. «Хлеб».
Н. Парукаў. «Не хапіла работы».
Я. Пархута. «Кропелька».
П. Прануза. «Добры дзень», «На градцы».
Б. Сачанка. «Насцечка».
В. Ткачоў. «Гузак».

## КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО НАВОКАЛ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы экалагічнай тэматыкі, пра ахову жывёл і раслін, стаўленне да хатніх жывёл.

### Для чытання і вывучэння ў класе

А. Вольскі. «Грыбы», «Безбілетная падарожніца».
В. Гарбук. «Кветкі».
Алесь Гарун. «Добрыя дзеці».
М. Пазнякоў. «Шпачынае гняздо», «Ландыш».
Ф. Рамашка. «Пацеркі на снезе».
В. Хомчанка. «Венікі».

### Для пазакласнага чытання

Я. Брыль. «Жыў-быў вожык».
А. Бутэвіч. «Цікаўная котка».
П. Кавалёў. «Жыві сабе, зайчык!».
Я. Пархута. «Снегавічок».
Ю. Свірка. «Ласіны стажок», «Сняжок».
А. Ставер. «Матылёк».
П. Ткачоў. «Шэрая курачка», «Ласяня».
М. Янчанка. «Бярозка».

## КОЛЕРЫ ГОДА. ВЯСНА
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне)

Творы пра абуджэнне прыроды пасля зімы, вясновыя змены.

Для чытання і вывучэння ў класе

Вера Вярба. «Пралеска».
Якуб Колас. «Прылёт птушак», «Песня аб вясне».
Я. Пархута. «Птушыны інтэрнат».
Ф. Рамашка. «Першы колер вясны».
Цётка. «Сварба».
Міхась Чарот. «Вясенняя раніца».

Для пазакласнага чытання

Г. Аўласенка. «Аб чым спяваюць птушкі?», «Ганарлівая кветачка».
Я. Бяганская. «Дзе начавалі рукавічкі?».
С. Валодзька. «Пчолы і кветкі».
Н. Галіноўская. «Вясновая бярозка».
Я. Галубовіч. «Вожык і Ручаёк», «Бярозавыя ледзянцы».
А. Дзеружынскі. «Птушыныя напевы».
Янка Журба. «Пчолка».
Р. Ігнаценка. «Птушыныя клопаты».
А. Кажэра. «Сінютка-анютка».
Клаўдзія Каліна. «Песня вясны», «Фіялка».
Т. Кляшторная. «Шпак».
У. Мазго. «Сябры вясны».
М. Маляўка. «Каб вясна хутчэй настала».
І. Муравейка. «Няўжо вясна?».
П. Пранузя. «Я вясну малюю».
П. Саковіч. «Коцікі».

## СЯМ’Я – ПРЫТУЛАК ДАБРЫНІ
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка навыку чытання)

Творы пра ўзаемаадносіны ў сям’і, павагу да бацькоў і старэйшых.

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Гарбук. «Незнарок і знарок».
М. Даніленка. «Чароўнае слова».
Г. Каржанеўская. «Памочніца».
Т. Кляшторная. «Дзіцячыя мары».
У. Мацвеенка. «Трускалкі».

І. Муравейка. «Праўнук Перамогі».
Л. Рублеўская. «Мышка Пік-Пік прыбірае норку».
П. Ткачоў. «Як сон знайшлі».
А. Якімовіч. «Што любіць бабуля?».

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Маме».
Р. Бензярук. «Малінавы чай».
Вера Вярба. «Матуліны рукі».
Н. Галіноўская. «Бабуліна песня», «Камп’ютаршчык», «Песня для мамы».
Я. Жабко. «Самы любы мой дзянёк».
В. Жуковіч. «Свая дапамога».
Клаўдзія Каліна. «Кампот».
У. Ліпскі. «Цацкі».
І. Муравейка. «Адно яечка на дваіх».
М. Пазнякоў. «Садзім алею».
М. Пісьмянкоў. «Бабчыны дранікі».
П. Прануза. «Маміны рукі», «Сам».
Я. Радкевіч. «Хто самы моцны?».
М. Рудзішкін. «Свята Перамогі».
Д. Слаўковіч. «Разумны аловак».
П. Сушко. «Зязюля».
П. Ткачоў. «Незвычайны дыктант».
В. Хомчанка. «Апельсін», «Мама», «Гузік».

КОЛЕРЫ ГОДА. ЛЕТА
(4 гадзіны)

Творы пра летні адпачынак, прыгоды.

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Дукса. «Развітаемся, званок!».
Клаўдзія Каліна. «Чэрвень і Сонейка».
І. Муравейка. «Колеры года».
Ф. Рамашка. «Слёзы лілеі».
Цётка. «Гутарка асоту з крапівою».

ФАРМІРАВАННЕ НАВЫКУ ЧЫТАННЯ

І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Станаўленне спосабу чытання цэлымі словамі. Інтанацыйнае аб’яднанне слоў у словазлучэнні і сказы. Нарошчванне тэмпу чытання і набліжэнне яго да хуткасці размоўнага маўлення навучэнца.

Фарміраванне правільнага чытання з захаваннем арфаэпічных норм беларускай мовы.

Авалоданне наступнымі відамі чытання: чытанне ўслых, выбарачнае чытанне, чытанне па ролях, выразнае чытанне.

Авалоданне сродкамі выразнага чытання:

яскравае і гучнае вымаўленне галосных і зычных гукаў у словах;

захаванне апавядальнай, пытальнай і клічнай інтанацыі сказаў;

захаванне паўз унутры і ў канцы сказа з апорай на знакі прыпынку (коску, двукроп’е, кропку з коскай і працяжнік), паміж абзацамі;

вылучэнне з дапамогай лагічнага націску слоў, якія абазначаюць пералік прадметаў, дзеянняў, якасцей, слоў-параўнанняў, слоў-звароткаў;

захаванне тону і тэмпу чытання ў залежнасці ад эмацыянальнага настрою твора, стану герояў;

вызначэнне з дапамогай педагагічнага работніка задачы выразнага чытання: што неабходна перадаць слухачам пры чытанні.

Фарміраванне ўмення ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці.

Фарміраванне ўніверсальных вучэбных дзеянняў:

вызначаць у тэксце незнаёмыя і незразумелыя словы, выразы; карыстацца зноскамі і тлумачальным слоўнікам з дапамогай педагагічнага работніка для высвятлення іх значэнняў;

вылучаць ключавыя (апорныя) словы ў тэксце;

з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай павінны прачытаць;

з дапамогай педагагічнага работніка планаваць дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні для рашэння вучэбнай задачы (пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні);

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу пры абмеркаванні матэрыялу;

захоўваць правілы ўзаемадзеяння ў групе, пары;

праяўленне паважлівага стаўлення да іншага меркавання.

Віды дзейнасці: слуханне, чытанне ўслых, чытанне пра сябе (моўчкі), пошукавае, выбарачнае чытанне, выразнае чытанне, чытанне па ролях; чытанне ланцужком па сказе, абзацы; камбінаванае чытанне (педагагічны работнік – навучэнцы); чытанне чыстагаворак, скорагаворак; распазнаванне і чытанне ключавых слоў абзаца, сэнсавай часткі, тэксту;

выкананне артыкуляцыйных, арфаэпічных і акцэнталагічных практыкаванняў; вызначэнне вучэбнай задачы чытання; устаноўка паслядоўнасці дзеянняў пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні; пошук памылак і моцных бакоў у сваім і чужым чытанні; ацэнка з пазіцый правільнасці і выразнасці.

## ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Чытацкія ўменні фарміруюцца падчас практычнай работы з тэкстам з дапамогай уключэння навучэнцаў у розныя віды дзейнасці.

Навучэнцы вучацца:

прагназаваць змест твора па ілюстрацыях і загалоўку;

вылучаць словы і выразы, якія перашкаджаюць разуменню прачытанага, вызначаць іх значэнне праз кантэкст, з дапамогай слоўніка і педагагічнага работніка;

знаходзіць у тэксце з дапамогай выбарачнага чытання адказы на пытанні педагагічнага работніка;

знаходзіць у тэксце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны; устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі;

вызначаць дзейных асоб, называць галоўную дзейную асобу;

знаходзіць з дапамогай выбарачнага чытання апісанне ўчынку героя, апісанне карцін прыроды;

знаходзіць з дапамогай педагагічнага работніка ў тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці; з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць адносіны аўтара да ўчынкаў героя;

уяўляць у сваёй свядомасці героя, карціну прыроды і расказваць аб гэтым;

ствараць характарыстыку героя твора (станоўчага, адмоўнага);

выказваць свае адносіны да ўчынку, героя;

вызначаць і фармуляваць з дапамогай педагагічнага работніка тэму і галоўную думку твора;

назіраць за будовай твора, з дапамогай педагагічнага работніка паслядоўна дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, карціны, эпізоды, азагалоўліваць кожную частку;

з дапамогай педагагічнага работніка складаць план апавядання, казкі, даючы загалоўкі іх пунктамі, або сказамі з тэксту, або назыўнымі ці пытальнымі сказамі;

падрабязна пераказваць прачытанае (апавяданне апавядальнага характару, казку) па пытаннях педагагічнага работніка, апорных словах, ілюстрацыях або гатовым плане;

вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора;

знаходзіць у вершы рыфму;

адрозніваць і называць творы фальклору (скорагаворка, загадка, прыказка, песня, казка);

адрозніваць і прыводзіць прыклады народных песень (калыханка, лірычная песня);

адрозніваць і называць творы аўтарскай літаратуры (літаратурная казка, апавяданне, верш);

адрозніваць мастацкі твор (празаічны і паэтычны);

вызначаць з дапамогай педагагічнага работніка тэму чытання навукова-пазнавальнага тэксту, вылучаць у ім факты і знаходзіць іх знешняе апісанне;

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і старонку;

канструяваць (мадэліраваць) план твора;

працаваць з табліцамі і схемамі;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу па пытаннях тэмы ўрока;

правяраць вынікі сваёй работы па прапанаваным узоры (крытэрыях);

дэманстраваць начытанасць і сфарміраванасць спецыяльных чытацкіх уменняў: суаднясенне прозвішчаў аўтараў з загалоўкамі твораў, вызначэнне тэм ва ўказаных творах, знаходжанне памылкі ў прапанаванай паслядоўнасці;

складаць выставы кніг на прапанаваную тэму;

шукаць у даведачнай літаратуры дадатковую інфармацыю.

## ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЯ ПРАПЕДЭЎТЫКА

Мастацкі твор: празаічны, паэтычны;

фальклор, вусная народная творчасць, творы фальклору: калыханкі, лірычныя песні, забаўлянкі, прыпеўкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, народная казка;

аўтар (празаік, паэт), літаратурная (аўтарская) казка, апавяданне, верш;

загаловак, назва твора, герой, персанаж твора;

аўтар, адносіны аўтара да ўчынкаў героя; адносіны чытача да ўчынкаў героя;

тэма, галоўная думка твора;

будова твора: сэнсавыя часткі, карціны, іх узаемасувязь;

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора: рыфма, параўнанне, адушаўленне нежывой прыроды, словы-дзеянні, якія

дапамагаюць аўтару «ажывіць» персанажа ў казцы, вершы, апавяданні, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы;

сродкі выразнасці маўлення і чытання: сіла голасу, тон, тэмп, паўза, лагічны націск, рытм.

Віды дзейнасці: назіранне за формай паэтычнага і празаічнага тэксту, будовай тэксту, мастацкімі сродкамі выразнасці (параўнанне, адушаўленне нежывой прыроды, эмацыянальна-ацэначныя словы), асаблівасцямі фальклорных жанраў; параўнанне мастацкіх тэкстаў розных жанраў і герояў; вызначэнне жанравых прымет, складанне выказванняў параўнаўчага характару, высноў.

## ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ

Літаратурна-творчая дзейнасць ажыццяўляецца з дапамогай уключэння навучэнцаў у наступныя віды дзейнасці:

ілюстраванне зместу твора малюнкамі (слоўнае і графічнае маляванне); прыдумванне подпісаў да іх;

прыдумванне назвы твора, подпісаў да ілюстрацый;

стварэнне невялікіх гісторый з героямі прачытаных твораў (уяўляемая сітуацыя);

творчая інтэрпрэтацыя твора: слоўнае маляванне паэтычных карцін, эпізодаў тэксту, слоўнае апісанне героя твора;

калектыўнае сачыненне невялікіх казак, апавяданняў па плане і апорных словах;

сачыненне (па аналогіі з творамі фальклору) скорагаворак;

чытанне па ролях дыялогаў герояў твора, асобных эпізодаў сюжэтных твораў (казка, апавяданне);

інсцэніроўка нескладаных сюжэтных твораў (казка, апавяданне) або асобных эпізодаў (з рэплікамі, мімікай і рухамі, пастаноўка «жывых карцін») пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка;

разыгрыванне дыялогаў з выражэннем настрою герояў.

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ (ПАДРЫХТОЎЧЫ І ПАЧАТКОВЫ ЭТАПЫ) КОЛА ЧЫТАННЯ

Падрыхтоўчы этап (4 г)

Дзіцячая мастацкая ці навукова-мастацкая кніга аб’ёмам да 20 старонак з тыповым афармленнем вокладкі: з указаннем прозвішча аўтара і назвы кнігі на вокладцы, з ілюстрацыямі ў тэксце і на вокладцы.

Невялікія мастацкія творы для самастойнага чытання навучэнцамі (1–5 старонак) з дзіцячай кнігі.

Вызначэнне структурных элементаў кнігі: вокладка, назва кнігі, прозвішча аўтара, старонка, пераплёт. Выкананне правіл беражлівага абыходжання з кнігай.

Фарміраванне элементарных бібліяграфічных уменняў: самастойны выбар кніг для чытання-разгляду з кніжнай выставы ў класным кутку чытання.

Пачатковы этап (5 г)

Дзіцячая кніга з ускладненым афармленнем вокладкі аб’ёмам да 30 старонак: без указання прозвішча аўтара на вокладцы (калі кніга выдадзена як тэматычны зборнік розных пісьменнікаў); з дадатковымі надпісамі (напрыклад, прозвішча мастака, назва серыі); прагназаванне зместу кнігі па вокладцы і ілюстрацыях; вызначэнне назвы і аўтара кнігі, правільнае называнне кнігі; самастойнае асэнсаванае чытанне кнігі пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка; выказванне ўласных уражанняў ад кнігі; устанаўленне суадносін твор – аўтар – кніга з дапамогай педагагічнага работніка.

Пашырэнне чытацкага кругагляду праз знаёмства з новымі кнігамі, прапанаванымі педагагічным работнікам.

Тыпы дзіцячых кніг для пазакласнага чытання:

кніга, якая змяшчае адзін твор аднаго аўтара (кніга-твор);

кніга, якая змяшчае некалькі твораў аднаго аўтара (кніга-зборнік аўтарскі);

кніга, якая змяшчае аб’яднаныя тэмай творы розных аўтараў (кніга-зборнік тэматычны, з дыферэнцыяцыяй тэматыкі чытання па жанрах, напрыклад, вершы аб роднай прыродзе, казкі пра жывёл, апавяданні пра дзяцей);

Дзіцячыя часопісы і газеты на выбар педагагічнага работніка.

Тлумачальны слоўнік.

На ўроках пазакласнага чытання дзеці знаёмяцца не з адной, а з некалькімі кнігамі (ад 2 да 4), якія аб’яднаны агульнай тэмай або жанрам.

Фарміраванне элементарных бібліяграфічных уменняў: выбар кнігі для чытання з класнай бібліятэкі ці сумесна з бібліятэкарам у бібліятэцы ўстановы адукацыі.

Арганізацыя сістэматычнага чытання кніг, часопісаў, газет на беларускай мове з класнай бібліятэкі і бібліятэкі ўстановы адукацыі, абмеркаванне прачытанага.

Выкананне правіл паводзін у бібліятэцы, паважлівае стаўленне да прафесіі бібліятэкара.

## ФАРМІРАВАННЕ САМАСТОЙНАЙ ЧЫТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Навучэнцы вучацца:

арыентавацца ў групе кніг (2–4) да чытання;

вызначаць тэму чытання па выставе кніг;

з дапамогай бібліятэкара выбіраць неабходную кнігу па дадзеных прыметах: па тэме ўрока пазакласнага чытання, па жанры і аўтарскай прыналежнасці (з экспазіцыі кніжнай выставы);

разглядаць новую кнігу, вызначаць яе змест па знешніх прыметах (назве і ілюстрацыях);

узнаўляць змест самастойна прачытанай кнігі ці невялікага твора з дзіцячай кнігі па пытаннях педагагічнага работніка; адказваць на пытанне, аб кім ці аб чым чыталі; пазнаваць знаёмыя эпізоды і сітуацыі на ілюстрацыях кнігі, раскрываць змест ілюстрацый; выказваць ацэначныя меркаванні аб паводзінах і ўчынках герояў; выказвацца на тэму «Чым і чаму цікавы гэты твор?»;

засвойваць сувязі: кніга – тэма, кніга – аўтар, кніга – жанр;

разглядаць і чытаць дзіцячыя часопісы і газеты;

засвойваць прыёмы чытання дзіцячага часопіса і газеты;

засвойваць спосабы дзеяння з тлумачальным слоўнікам.

## АСНОЎНЫЯ ВЕДЫ І ЎМЕННІ

Навучэнцы атрымліваюць уяўленні аб прызначэнні бібліятэкі, абанемента, чытальнай залы, бібліятэкара.

Знаёмяцца з правіламі карыстання бібліятэкай, правіламі адносін з кнігай.

Навучэнцы вучацца:

выбіраць кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай (па тэме і жанры, аўтарскай прыналежнасці) з дапамогай кніжнай выставы, кніжнага плаката, бібліятэкара;

адрозніваць кнігі па жанрах (казка, апавяданне, верш);

адрозніваць асноўныя элементы кнігі: вокладка, тытульны ліст, карашок, старонкі, змест;

вызначаць прыкладны змест незнаёмай кнігі па яе назве (аўтар, загаловак) і ілюстрацыях (на вокладцы і ў тэксце);

правільна называць кнігу (прозвішча аўтара, загаловак);

суадносіць знаёмыя творы і дзіцячыя кнігі з прозвішчамі пісьменнікаў.

Атрымліваюць уяўленне пра газету і часопіс як перыядычныя выданні.

## ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ І ГРУПАВАЯ РАБОТА З КНІГАЙ У ПАЗАЎРОЧНЫ ЧАС

Наведванне бібліятэкі і арыентацыя ў свеце кніг па тэматычнай і аўтарскай кніжнай выставе ў прасторы бібліятэкі, па рэкамендацыйных спісах з дапамогай бібліятэкара.

Састаўленне кніжных выстаў па тэме, указанай педагагічным работнікам.

Расстаноўка кніг па тэмах у класнай бібліятэцы.

Праца ў «майстэрні па рамонце кніг».

Удзел у літаратурных ранішніках з дапамогай бібліятэкара.

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

А. Грачанікаў «Беларускія краявіды».

А. Дзеружынскі «Хлебная скарынка».

У. Карызна «Самая лепшая».

Якуб Колас «Адлёт жураўлёў».

Якуб Колас «Песня аб вясне».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ II КЛАСА

Ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы сустракаліся на старонках падручніка, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

правілы карыстання кнігамі.

Мець першапачатковае ўяўленне пра:

творы вуснай народнай творчасці (пацешкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, казкі);

віды народных песень (калыханка, лірычная песня);

творы аўтарскай літаратуры (апавяданне, верш, казка);

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора (параўнанне, адушаўленне нежывой прыроды, эмацыянальна-ацэначныя словы);

сродкі выразнага чытання (сіла голасу, паўза, інтанацыя сказа).

Умець:

слухаць казкі, апавяданні, вершы;

чытаць цэлымі словамі ўслых і тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

чытаць цэлымі словамі правільна з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы: захоўваць найбольш распаўсюджаныя арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], [дз’], [дж], спалучэння [шч], падоўжаных зычных);

Выпрацоўка навыкаў правільнага вымаўлення гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], [дз’], [дж], спалучэння [шч], падоўжаных зычных; фарміраванне ўмення захоўваць акцэнталагічныя нормы пры чытанні слоў з вызначаным націскам.

выразна чытаць мастацкі твор з захаваннем інтанацыі сказа і паўз на знаках прыпынку;

правільна называць прачытаны твор, кнігу (прозвішча аўтара, назва);

арыентавацца ў змесце твора да чытання (па загалоўку і ілюстрацыях);

вылучаць у тэксце незразумелыя словы і выразы, вызначаць іх значэнне праз кантэкст і з дапамогай слоўніка;

з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай павінны прачытаць;

планаваць дзейнасць: з дапамогай педагагічнага работніка называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразнага чытання;

складаць вусны разгорнуты адказ на пытанне педагагічнага работніка, пацвярджаць адказ урыўкам з тэксту;

знаходзіць у тэксце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны;

вылучаць дзейных асоб твора;

знаходзіць у тэксце эпізод з апісаннем учынку героя; выказваць свае адносіны да ўчынку героя;

падрабязна пераказваць невялікі твор (апавяданне апавядальнага характару, казку, сюжэтны верш) па гатовым плане, пытаннях педагагічнага работніка, апорных словах, ілюстрацыях;

адрозніваць і называць творы фальклору: скорагаворка, загадка, прыказка, песня, казка);

адрозніваць і прыводзіць прыклады народных песень (калыханка, лірычная песня), загадак, скорагаворак, прыказак, казак, вершаў і апавяданняў з кола вывучаных твораў;

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву патрэбнага твора і адпаведную старонку;

выбіраць кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай (па тэме і жанры, аўтарскай прыналежнасці) з дапамогай бібліятэкара.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

выбіраць у бібліятэцы і чытаць кнігі, дзіцячую перыёдыку;

карыстацца відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі з прыцягненнем бібліятэкара;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

знаходзіць у тлумачальным слоўніку значэнне невядомага слова;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.